**НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ**

**Часопіс «Маладосць», на старонках якога апошнім часам імя Лаўрэна Юрагі з'яўлялася ўжо не раз, неяк назваў яго «творцам гістарычных стылізацый». Прызнаюся, у дачыненні да такой характарыстыкі мне вельмі спадабалася пазіцыя самога пісьменніка: «Задача аўтара гістарычнай прозы не ў пісанні на тагачаснай гаворцы — ён проста павінен так «прышчапіць» даўнія словы да галінкі сучаснай беларускай мовы, каб яны на ёй закрасавалі». А яшчэ больш мяне як чытача радуе тое, што Лаўрэн Юрага падчас кожнай чарговай вадроўкі ў далёкую мінуўшчыну імкнецца ісці сваім шляхам, а не па стаптаных сцежках, што пакінулі ў айчыннай гістарычнай прозе яго славутыя папярэднікі.**

**Алесь БАДАК.**

Лаўрэн ЮРАГА

# ЗАЛАТЫ МЕДАЛЬЁН



*— ...Да заўтра, Магістру, — кажа слуга, гасячы свечку, і йдзе з пакоя.*

*— Да заўтра... Заўтра на світанні мяне не стане... — думаеш уголас.*

*Слуга прыпыняецца ў дзвярах:*

*— Што вы сказалі, пане?*

*— Нічога... Можаш ісці, Жак!*

*Слуга выходзіць, і ты застаешся сам-на-сам з сабой. І з агнём у каміне... Калісьці, яшчэ ў дзяцінстве, ты любіў углядацца ў яго. Ты бачыў у полымі нязнаныя краіны чужых народаў, неўтаймоўныя хвалі непераадольных мораў, палі жорсткіх бітваў, зруйнаванні муроў і падзенні сталіц, караваны купцоў і шумныя рынкі, чароды дзіўных звяроў ды птушак...Толькі значна пазней ты пачаў разумець, што, калі тое болей ніхто не бачыць, гэта зусім не азначае, што яго не існуе.*

*Спярша тыя відзежы ніяк не ўплывалі на тваё жыццё. Але ты марыў стаць паэтам і прагнуў дабіцца, дзякуючы таленту, ласкі ў караля — таму пачаў запісваць бачанае ў катэнах. Ды нікому не паказваў... Так сталася, што ты надрукаваў іх, толькі ўжо здабыўшы каралеўскую ласку сваёй вучонасцю ды ахвярнасцю. Ты здабыў усё, чаго прагнуў, але ці шчаслівы ты? У тваім жыцці былі слава і няшчасце, багацце і небяспека страшнай смерці — зрэшты, як амаль ва ўсіх, каго ты ведаў. А цяпер ты ведаеш, што неўзабаве памрэш, — але ці страшна табе? Не страшна... Што можа быць страшней за гэта — за адсутнасць боязі перад абліччам немінучай смерці, за нежаданне жыць далей?.. Раптам ты прыгадваеш, што не ўсё яшчэ дарабіў. З намаганнем садзішся на рыплівым ложку, спускаеш ногі на падлогу і, шаркаючы, клыгаеш да секрэтэра; твае старэчыя калені трымцяць і падгінаюцца. Ты дастаеш з шуфляды даўно падрыхтаваны ланцужок з залатым медальёнам і, зацісНуўшы яго ў руцэ, цяжкім высілкам дабрыдаеш назад да ложка. Валішся на яго і ляжыш нейкі час, не варушачыся, ды спрабуеш аддыхацца поўнымі хрыпаў грудзямі. Потым зноў, у які ўжо раз, пачынаеш разглядаць медальён. Нічога асаблівага — проста невялікая акруглая пласцінка, нават без выявы. Толькі надпіс. Дакладней, лічбы: «1791». Гэта будзе тваім перадсмяротным жартам. Жартам, з якога пасмяюцца толькі праз 225 гадоў. Усё ж, прынамсі, ты маеш пачуццё гумару, калі твой досціп мае ператрываць стагоддзі; дарэчы, «225» — прыгожая лічба. Ты паварочваешся на бок і спрабуеш занурыцца ў сон...*

* * *

Якая жахлівая ноч! Якімі жахлівымі сталі ўсе мае ночы! Я зноў не сплю — ужо каторы раз сустракаю ранак у бясонні. Не магу заснуць, бо варта сплюшчыць павекі — і ясна бачыцца ўсё тая ж карціна: куля, што ляціць мне ў галаву і ад якой я не магу ўхіліцца. Сяджу пры вогнішчы, папраўляю даўгім кіем перагарэлыя дровы — жарынкі снапом узносяцца ў чорнае начное неба. Яны падобныя да пáры, што ўзнімаецца воблакам над палявым катлом, калі кухар прыпадымае накрыўку, каб пакаштаваць амаль ужо гатовую страву. Жарынкі — гэта пáра агню... У ягоным чырванаватым пабліску мне явяцца поўныя дзіўных забудоў незнаёмыя гарады, золата царскіх скарбніц ды павіткі прыгажунь. І я сяджу пры вогнішчы, углядаюся ў яго, каб хоць неяк забыцца на сон. Каб не думаць пра хуткую смерць, бо які ж гэта жахлівы дар — ведаць, калі памрэш! Дар, які мне дастаўся праз маё глупства ды напышлівасць і якога я так быў бы рады пазбыцца...

Калі мы ўваходзілі ў сабор, былі нібы п'яныя ад нашае моцы і неперамажнасці, ад нашае хвацкасці і нявeры. Чалавек, які ламае людскія правы, адчувае сябе моцным; той жа, хто ламае правы Божыя, чуецца неперамажным. Да часу... Так і мы: рэвалюцыя дала нам адчуць сябе багамі, бо мы адрынулі і людскoе, і боскае. Увесь Парыж, уся Францыя, не — увесь свет, здавалася, ляжаў ля нашых ног.

Першай справай мы спусціліся ўніз, да крыпты і там знайшлі багата спажывы. Бо ў гэтай крыпце пахаваны каралеўскія прыдворныя, а яны і на той свет не любяць адыходзіць без сваіх багаццяў. Адклалі мы стрэльбы на сходы, пассоўвалі вечкі з каменных трунаў ды назбіралі, зацята сварачыся між сабой, плойму золата і каштоўнасцяў. А апошняй была труна таго самага чарадзея — і ён перад якімсьці каралём заслужыўся. Мы прачыталі пра яго на каменным веку, бо было напісана не на лаціне, а па-французску. І яшчэ мы прачыталі: «О, нашчадак! Не варушы гэтых астанкаў і не зайздросці супакою таго, хто тут ляжыць!» Ці ж мы тады каму зайздросцілі — а тым больш мерцвяку? І ці ж мы маглі збаяцца ягонага праклёну?!

Века цяжкое было — учатырох ледзь звярнулі яго набок, адкрыўшы зеўра труны. А потым не ўтрымалі — яно бразнулася аб падлогу і раскалолася; аскепкі — дарма, што з мармуру! — паляцелі ва ўсе бакі, ледзь нас саміх не пакалечыла. Я тады вось і падумаў, што дарма мы ў гэтую труну палезлі — дабром тое не скончыцца. Так і атрымалася. А труна была бедная — толькі сатлелыя лапікі вопраткі ды косці. Мы ж думалі шмат золата знайсці, калі ён такім славутым чараўніком ды празорцам быў.

Аднак жа мой сябрук Поль здагадаўся паварушыць між костак і выцягнуў з-пад чэрапа залаты медальён на ланцужку. Я за ім палез, але болей — нічога! Зайздрасць мяне тады ўзяла і злосць нейкая дурная. Я і кажу, а ці ведаеце, што калі хто з таго чэрапа вып'е, то моц чараўніка да яго пяройдзе. Яны з мяне смяяцца: што ж ты сам, маўляў, не вып'еш — ці баішся? Дзе ж такое пакінуць?! Я і наліў у чэрап віна, піць пачаў. А ў той момант Поль гукнуў, што на медальёне нешта напісана. І прачытаў адразу: «1-7-9-1». А мяне ажно як праняла: гэта ж сёлетні год! Значыць, сапраўды стары чараўніком быў: ведаў, што мы прыйдзем, супакой яго парушым. І тады я зразумеў, што ёсць шмат рэчаў, пра якія мы не ведаем і ведаць не павінны. І што вернецца нам наша пыха карай, што споўніцца маё блюзнерскае прароцтва — бо ў той момант паверыў я, што яно мусіць споўніцца!

Так і сталася. Ужо ўвечары я злавіў сябе на тым, што, гледзячы на полымя вогнішча, бачу дзіўныя мроі. Адчуў я, што не мроі гэта зусім, а падзеі, якія адбываюцца насамрэч — хіба што толькі не тут ці не цяпер. А калі лёг спаць, дык убачыў я поле бітвы, сябе на ім, і кулю, што ляціць мне ў галаву. І зразумеў, што не абмінуць мне тае кулі, больш за тое — ведаў, калі гэта здарыцца: усяго пару дзён мне засталося. Таму вось я болей і не сплю, бо не магу змусіць сябе зноў бачыць сваю смерць, не хачу думаць пра яе і чакаць, пакуль прыдзе.

* * *

Жаўнер Эцьен Бэрньe загінуў наступнага дня — 31 жніўня 1791 года. Ён не пабачыў кулі, што забіла яго, разнёсшы галаву...



**Па гарызанталі: 6**. Ручка для пісання, у якой чарніла аўтаматычна падаецца да пяра. **8**. Адмоўна зараджаны электрод. **9**. Асадкавая горная парода, вязкая ў вільготным стане, якая ляжыць на паверхні зямлі або пад глебай. **10**. Адна з самых «марозаўстойлівых» птушак; можа вытрымліваць тэмпературу да мінус 90-110 градусаў. **11**. Імя актрысы Фрэйндліх. **12**. Збянтэжанасць, трывога, хваляванне. **13**. Спецыяльная пляцоўка ў тэатры, на якой адбываюцца спектаклі. **15**. Познаасенні жаўтаватага колеру ядомы грыб, які расце каля пнёў або каранёў дрэў. **18**. Жаночыя ці дзіцячыя панчохі, вывязаныя разам са штанамі. **21**. Адзін з асноўных жанраў інструментальнай музыкі. **22**. Буйное спаборніцтва на парусных, вёславых і водна-маторных суднах. **23**. Тое, што і медуніца; расліна з дробнымі пахучымі кветкамі. **26**. Мерапрыемства для павышэння кваліфікацыі. **29**. Парны бальны танец свабоднай кампазіцыі з энергічным, выразным рытмам. **32**. Ваза для маскіроўкі кветкавага вазона. **33**. Дзікі асёл, які водзіцца ў Паўднёва-Заходняй Азіі. **34**. Кляймо на скуры ці на рагах сельскагаспадарчых жывёл як распазнавальны знак. **35**. Гук капытоў на бруку. **36**. Вобласць натуральнага пашырэння якога-небудзь прадмета, з'явы. **37**. Каштоўны камень сінявата-зялёнай або блакітнай афарбоўкі, разнавіднасць берыла.

**Па вертыкалі: 1**. Пачуццё вялікай асалоды, задаволенасці, якое выклікае вясёлы настрой. **2**. Прадстаўнік народнасці, які жыве пераважна ў Хабараўскім краі (Расія). **3**. Гара з кратарам на вяршыні, праз які час ад часу вывяргаюцца лава, агонь, попел. **4**. Набожны чалавек, які шмат моліцца. **5**. Майстэрня для пашыву адзення, абутку, рамонту бытавой тэхнікі. **7**. У Францыі — невялікі рэстаран, бар з пітвом і закускамі. **13**. Прыстасаванне на колцах або роліках, на якім катаюцца дзеці пры адштурхоўванні ад зямлі нагой. **14**. Выканаўца роляў у тэатры. **16**. Будзе хлеб — будзе і ... (прык.). **17**. Паўднёваамерыканскі трохпальцы страус. **19**. Азёрны або ліманны глей як лекавы сродак. **20**. Працэс расстання з грашыма. **24**. Тонкія дошчачкі для абівання сцен пад тынкоўку. **25**. Спецыяльна прыгатаваная для піцця вадкасць. **27**. Штат на поўначы ЗША, дзе выпала сняжынка дыяметрам 38 см і таўшчынёй 20 см. **28**. Ступень, да якой што-небудзь нагрэта. **30**. Драбнюткія частачкі нейкага рэчыва, якія вылучыліся з раствору, вадкасці і аселі на дно. **31**. Той, хто займаецца апрацоўкай і вырабам шкур.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі: 6.** Аўтаручка. **8.** Катод. **9.** Гліна. **10.** Качка. **11.** Аліса. **12.** Смута. **13.** Сцэна. **15.** Апенька. **18.** Калготы. **21.** Саната. **22.** Рэгата. **23.** Мядунка. **26.** Семінар. **29.** Танга. **32.** Кашпо. **33.** Анагр. **34.** Таўро. **35.** Цокат. **36.** Арэал. **37.** Аквамарын.

**Па вертыкалі: 1.** Радасць. **2.** Нанаец. **3.** Вулкан. **4.** Багамол. **5.** Атэлье. **7.** Бістро. **13.** Самакат. **14.** Актрыса. **16.** Песня. **17.** Нанду. **19.** Гразі. **20.** Трата. **24.** Дранка. **25.** Напітак. **27.** Мантана. **28.** Нагрэў. **30.** Асадак. **31.** Гарбар.

## Неспрыяльныя дні і гадзіны ў верасні

**2, пятніца, 23.00 – 24.00**
**3, субота, 0.00 – 3.00**
**5, панядзелак, 2.30 – 14.30**
**8, чацвер, 3.00 – 4.30**
**10, субота, 3.00 – 15.00**
**12, панядзелак, 12.00 – 23.00**
**14, серада, 17.30 – 24.00**
**15, чацвер, 0.00 – 4.30**
**16, пятніца, 21.00 – 24.00**
**17, субота, 0.00 – 6.30**
**18, нядзеля, 22.00 – 24.00**
**19, панядзелак, 0.00 – 7.00**
**21, серада, 5.30 – 8.00**
**23, пятніца, 10.00 – 11.30**
**25, нядзеля, 3.30 – 16.00**
**27, аўторак, 11.00 – 23.00**
**29, чацвер, 12.30 – 24.00**
**30, пятніца, 0.00 – 10.30**

**Крынічка**

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# Ападаюць слівы



**Ёсць у сліў непрыемная асаблівасць: ледзь што не спадабалася — адразу пачынаюць абсыпацца плады. Прычым так актыўна, што можна пазбавіцца ўсяго ўраджаю. Каб гэтага не адбылося, трэба ведаць, як дагадзіць сліве.**

***БЕЗ ШКОДНІКАЎ***

Часцей за ўсё абсыпаюцца слівы з-за лічынак пільшчыка і слівовай пладажэркі.

У гэтым выпадку на плодзе будуць чарвяточыны. Абараніць ураджай можна апырскваннем актарай або канфідорам. Праўда, складанасць у тым, што пладажэрка дае тры пакаленні за лета, таму і апырскваць трэба не менш за тры разы.

А бывае, што на пладах няма ніякіх чарвяточын, але яны ўсё роўна абсыпаюцца. Прычына ў экзатычным шкодніку слівы — таўстаножцы. Яна адкладае яйкі ў костачку завязяў. Праз некалькі тыдняў плады адвальваюцца без бачных пашкоджанняў. Калі разрэзаць такі плод, то можна ўбачыць, што костачка развальваецца на дзве часткі.

Ад таўстаножкі праводзяць апырскванне адразу пасля цвіцення і праз два тыдні пасля першай апрацоўкі. Але галоўнае — трэба збіраць апалыя плады і закопваць у зямлю. Калі сабраць усё, то хімічнай апрацоўкі на наступны год не спатрэбіцца.

***ГЛЕБА***

На сухіх глебах слівы растуць дрэнна. Плады ў іх драбнеюць, хутка абсыпаюцца. Таму даводзіцца паліваць не менш за пяць разоў за сезон. Прычым пры кожным паліве глебу трэба пралiваць да глыбіні 50-60 см.

А за два тыдні да збору ўраджаю сліў спецыялісты рэкамендуюць праводзіць добрае ўвільгатненне глебы. І настойліва падкрэсліваюць: чым лепшае харчаванне ўсяго дрэва — тым больш паўнавартасных завязяў на сліве захоўваецца да поўнага паспявання. На жаль, на практыцы гэта далёка не заўсёды ўлічваецца.

Чамусьці лічыцца, што дрэва здольна само сябе ўсім неабходным забяспечыць. Але гэта магчыма на добра запраўленых, падрыхтаваных у свой час глебах. На астатніх сліве часам не хапае самага неабходнага, і гэта адмоўна адбіваецца на яе развіцці і плоданашэнні.

***УГНАЕННІ***

Так, пры недахопе азоту ў слівы не толькі зніжаецца прырост, лісце жоўкне і памяншаецца ў памеры, але адначасова мала завязваецца пладоў і моцна абсыпаюцца завязі. Калі не хапае калію, абсыпаюцца буйныя завязі. Выснова простая — сліва мае патрэбу ў дадатковым харчаванні, а таму варта ўвесь час карміць яе арганічнымі і мінеральнымі ўгнаеннямі, асабліва на бедных глебах.

Дасведчаныя садоўнікі імкнуцца ўнесці пад слівавыя дрэвы ў першай палове лета каравяк або падкарміць іх гнаявой жыжкай, растворам птушынага памёту і іншымі хуткадзейнымі ўгнаеннямі.

***ХВАРОБЫ***

Шмат шкоды наносіць ураджаю сліў манiліёз. Калі бакі плода сцягваюць «сінякі» — гэта ён і ёсць.

Супраць маніліёзу шырока ўжываюць прэпараты хорус і скор. Заадно яны дапамогуць справіцца з кокамікозам і дзіркаватай плямістасцю, ад якіх хоць і не абсыпаюцца плады, але моцна церпяць парасткі і лісце.

# Вырошчванне часнаку з «бульбачак»

**Не кожны агароднік можа дазволіць сабе вырошчваць азімы часнок зубкамі, бо пры гэтым метадзе пасадкі іх спатрэбіцца вельмі шмат. Ёсць яшчэ адзін метад — вырошчванне часнаку з «бульбачак» — паветраных цыбулінак.**

На азімым часнаку ў чэрвені ўтвараюцца стрэлкі. У гэтых стрэлак на канцы развіваюцца, замест суквецця, паветраныя цыбулінкі. Іх яшчэ называюць «бульбачкі».

На большасці раслін стрэлкі трэба зрэзаць накасяк або абламаць (не выдзіраць), каб атрымаць больш буйныя галоўкі часнаку, а на самых добра развітых пакінуць стрэлкі з суквеццямі. Далей трэба дачакацца часу, калі абгортка суквецця лопне і «бульбачкі» набудуць афарбоўку, якая ўласціва канкрэтнаму сорту часнаку. Пасля гэтага трэба цалкам вырваць расліну і падсушыць.

Перад пачаткам сяўбы паветраныя цыбулінкі трэба вызваліць з суквецця, адабраць самыя буйныя. Пасеў трэба праводзіць з другой дэкады верасня да сярэдзіны кастрычніка.

З кожнай «бульбачкі» ў ліпені наступнага года вырасце адназубка значных памераў, якая будзе выдатным пасадачным матэрыялам пад зіму для вырошчвання буйных галовак.



**Падрыхтоўка градкі:**

Градку для вырошчвання часнаку з «бульбачак» трэба падрыхтаваць наступным чынам: на 1 квадратны метр унесці 3-4 кілаграмы кампосту або перагною і 1 сталовую лыжку суперфасфату. Далей усё перакапаць і разраўнаваць глебу на градцы. Затым папярок градкі зрабіць баразёнкі глыбінёй 2-3 сантыметры. Адлегласць паміж баразёнкамі зрабіць 10 сантыметраў. «Бульбачкі» трэба раскласці ў іх на адлегласці 1-2 сантыметры адна ад другой. Потым трэба прыкрыць баразёнкі глебай і пакінуць пад зіму. Не лішнім будзе, асабліва калі чакаецца халодная зіма, правесці мульчыраванне градкі слоем пілавіння (2-3 сантыметры). Вясной, пры адтайванні глебы, пілавінне трэба прыбраць.

**Даты | Падзеі | Людзі**

**31 ЖНІЎНЯ**

**1161** год — 855 гадоў з часу стварэння полацкім майстрам Лазарам Богшам унікальнага помніка старажытнабеларускага ювелірнага мастацтва — Крыжа Еўфрасінні Полацкай — спаўняецца ў гэтым годзе. У пачатку 1941 г., у час бітвы за Магілёў, крыж знік, і яго след абарваўся. Адсутнасць неацэннага помніка культуры стала незаменнай стратай для грамадства.



**1821** год — дата нараджэння нямецкага вучонага, аўтара фундаментальных прац па фізіцы, біяфізіцы, фізіялогіі, псіхалогіі Германа Гельмгольца. Упершыню матэматычна абгрунтаваў закон захавання энергіі, паказаўшы яго ўсеагульны характар.

**1916** год — нарадзілася Зінаіда Браварская, актрыса, рэжысёр, педагог, народная артыстка Беларусі. Сцэнічную дзейнасць пачала ў Тэатры юнага гледача. З 1938 года — у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы. Актрыса выразнага сцэнічнага малюнка, выканаўца драматычных і вострахарактарных роляў. Здымалася ў кінафільмах «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Хто смяецца апошнім». Памерла ў 2005 годзе.

**1935** год — данбаскі шахцёр Аляксей Стаханаў перавысіў сутачную норму вуглездабычы ў 14 разоў, што паслужыла пачаткам «стаханаўскага руху». У снежні 1935-га пленум ЦК ВКП (б) пастанавіў ператварыць «стаханаўскі рух» у рух мільёнаў. Ён стаў асноўнай формай сацыялістычнага спаборніцтва і хутка ахапіў усю краіну. Ужо праз некалькі месяцаў амаль на кожным савецкім прадпрыемстве з'явіліся свае стаханаўцы.

**Было сказана**

**Максім ТАНК, народны паэт Беларусі:**

*«Маўчанне*
*Ніколі не было*
*І не будзе золатам:*
*Яно — або*
*У шмат разоў даражэйшае,*
*Або — нічога не вартае».*

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 6.16 | 20.02 | 13.46 |
| Віцебск | — 6.04 | 19.54 | 13.50 |
| Магілёў | — 6.06 | 19.52 | 13.46 |
| Гомель | — 6.06 | 19.46 | 13.40 |
| Гродна | — 6.32 | 20.16 | 13.44 |
| Брэст | — 6.35 | 20.14 | 13.39 |

## Месяц

***Апошняя квадра 25.08—31.08. Месяц у сузор'і Дзевы.***

## Імяніны

***Пр.** Георгія, Дзяніса, Івана, Міхаіла, Рыгора, Яўгена.*
***К.** Ізабелы, Паўліны, Багдана, Марка.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**— Што гэта ты бараду адгадаваў? Навошта?**

**— Ды надакучыла. Усе мне кажуць, маўляў, твар у цябе прыгожы, але ж вельмі жаноцкі.**

**— А цяпер як?**

**— Ну як, як. Уяві сабе бабу з барадой...**

Люся кожную раніцу прыносіла свайму мужу каву ў ложак.

...Таму што, калі яна не паспявала, раніца пачыналася з піва.

**— Тата, а праўда, што мяне ў капусце знайшлі?**

**— Праўда, Сёма. А ўчора за гаражамі. А пазаўчора на прыпынку. Хопіць гарэлку піць, сынок!**




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3555.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 30 жніўня 2016 года.